УДК 821.161.3-31*А. Брава

К. В. Ніцыеўская

Навук. кір. – А. В. Брадзіхіна, канд. філал. навук, дацэнт

# МАТЫЎ ФОБІІ Ў АПОВЕСЦІ АЛЕНЫ БРАВА «ІМЯ ЦЕНЮ – СВЯТЛО»

«Імя ценю – святло» – аповесць А. Брава, дзе фобія як псіхічная і літаратурная з‟ява займае вызначальнае месца. Мэта дадзенага артыкула – выявіць асаблівасці адлюстравання пісьменніцай матыву фобіі, адметнасці яе рэалізацыі ў творы, што дагэтуль у сучасным літаратуразнаўстве здзейснена не было. У ходзе даследавання атрыманы наступны вынік: для паказу фобій як псіхічных з‟яў аўтар падрабязна разгортвае перад чытачом першапрычыны, сімптомы і наступствы дадзенага псіхічнага стану; з літаратурнага боку цікавасць уяўляе гісторыя барацьбы пратаганісткі з фобіямі, увасабленне ў галоўным персанажы лёсу і характару нацыі.

Існуе шэраг складаных псіхалагічных станаў, якія цікавяць не толькі навуку, але і літаратуру на працягу ўсёй гісторыі яе развіцця. Сярод такіх – пытанне існасці страху, таго комплексу адчуванняў, што ён спараджае, а таксама глыбіні ўздзеяння гэтага пачуцця на чалавека, асабліва калі набліжаецца да мяжы пераходу ў фобію. Апошняя – таксама страх, але больш стойкі і часта нават беспадстаўны. Асобам, што пакутуюць на фобіі, дастаткова адной думкі пра адпаведны прадмет ці сітуацыю, каб Литературоведение 102 адчуць занепакоенасць і жах, прычым большасць добра разумее празмернасць рэакцыі і беспрычыннасць узнікнення падобнага эмацыянальнага стану. Асаблівай увагі заслугоўвае той факт, што, нават звяртаючыся да спецыяліста, не кожны можа назваць крыніцу ўзнікнення сваёй фобіі [1]. Да ліку аўтараў, якія распрацоўваюць у сваіх творах мастацкія канцэпцыі страху, спрабуючы даць ім сваё вытлумачэнне, адносіцца і А. Брава. Яе аповесць «Імя ценю – святло» мае адпаведны падзагаловак – «Гісторыя адной фобіі». У цэнтры ўвагі чытача аказваецца пратаганістка з псіхалагічнымі праблемамі, гісторыя якой праецыруецца на беларускі народ. Пісьменніца спрабуе раскрыць пытанне паходжання і асаблівасцей страхаў, сродкаў і спосабаў іх пераадолення. Нарэшце, А. Брава праводзіць паралель паміж псіхічным станам Вікторыі, галоўнай гераіні твора, і тыповым беларусам, які вымушаны шукаць сваё месца сярод народаў, бунтуючы супраць сістэмы і крыважэрнага лёсу, ва ўсе часы нязменна шчодрага на іспыты і выпрабаванні. У псіхалогіі існуе некалькі тэорый узнікнення фобій. Сярод іх найбольш папулярнымі лічацца наступныя: псіхадынамічная, біхевіярысцкая, тэорыя мадэлявання. Біхевіярысцкая тэорыя, сутнасць якой заключаецца ў фарміраванні страхаў шляхам класічнага абумоўлівання, вызначаецца ўплывовасцю ў клінічнай сферы. А. Брава абрала менавіта яе ў якасці асноўнай лініі сюжэта. Біхевіярысты лічаць: дзве падзеі, якія адбываюцца адначасова, трывала звязваюцца ў розуме чалавека, пасля чаго паяўляецца аднолькавая рэакцыя на кожную з іх. На Вікторыю ў дзяцінстве пастаянна сварылася маці, называючы нікчэмнай дрэнню і параўноўваючы з іншымі (лепшымі) дзецьмі. Каб даказаць сваю карыснасць і ідэальнасць, гераіня імкнулася быць лепшай ва ўсім, рабіць «на выдатна» любую дробязь, якая, на яе думку, можа кінуцца маці ў вочы. Паступова гэта перарасло ў хваравіты перфекцыянізм, з‟явіўся заканамерны страх перад так званай публікай, якая глядзіць на яе і, як маці, штохвілінна ацэньвае, чакаючы пэўных вынікаў. Паколькі адпачыць, разняволіцца і быць сабой пры такіх умовах можна выключна на самоце, страх гераіні пераўтварыўся ў фобію не толькі натоўпу ці любых прыватных сустрэч, а і ў фобію быць натуральнай, сапраўднай і асуджанай за гэта. Паспрыяў з‟яўленню новага страху ў значнай ступені БМС – былы муж Сярожа, – якому падабалася «Упэўненая Пані»; насамрэч сапраўднае «я» пратаганісткі ніяк не суадносіцца з рашучасцю і самаўпэўненасцю. Апошнія некалькі старонак твора ўяўляюць сабой рэфлексію Вікторыі над мінулым жыццём (а ці жыццё гэта?). Праблема крывадушнасці і шчырасці ў гэтых развагах 103 становіцца магістральнай: «Аднаму нас не вучылі і не вучаць: быць самімі сабой. Убогая і няшчасная твая крывадушнасць у вартай жалю спробе выглядаць пераможцай чаго б гэта ні каштавала, твая труслівая ўсмешка і “бесклапотная”

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

балбатня на іх сходках, калі ўнутры ўсѐ скалыналася ад трывогі, – вось гэта і было падзеннем! А што да твайго страху, дык гэта – страх выкрыцця тваѐй хлусні. Гэта крык адчаю дзяўчынкі, якую ты ў сабе затуркала – акурат як тое рабіла мама! – і таксама, як мама, ты яе ў сабе не любіш, не любіла» [2]. У выніку сфарміраваўся механізм фобіі Вікторыі, дзе здзекі маці з галоўнай гераіні твора – безумоўны стымул, унутраная неабходнасць быць ідэальнай – умоўны стымул, а наступствы гэтага, у тым ліку боязь натоўпаў і нават невялікіх кампаній, – умоўная рэакцыя. Па-другое, хоць і было заяўлена, што біхевіярысцкая тэорыя – аснова псіхалагізму твора, у тэксце можна сустрэць элементы так званага мадэлявання, сутнасць якога заключана ў пераймані страхаў назіральнікам ад таго, за кім вядзецца назіранне. У нашым выпадку маленькая Вікторыя, якая назірае за сваѐй маці, становіцца падобнай да яе ахвярай абставінаў, крывадушнай і фальшывай. Па сутнасці, абедзьве жанчыны вымушаны пражываць не сваѐ жыццѐ. Адметна, што ў аповесці паказана не адна канкрэтная фобія, як заяўлена ў падзагалоўку, а тры: пайнефобія, ахлафобія і катагелафобія [1]. Так, гераіня пачала траціць прытомнасць з-за страху быць пакаранай маці: у стане гэтым ѐй бачылася адзінае бесканфліктнае выйсце з сітуацыі. Акрамя гэтага, у дзяўчыны выразна праявіліся і іншыя страхі: страх перад натоўпам і страх быць высмеянай іншымі. Дык ці быў хоць адзін сапраўдны шанец на тое, што галоўная гераіня твора паспяхова пераможа іх усе? У клінічнай псіхалогіі існуе паняцце тэрапіі фобій. Калі глядзець на дзеянні Вікторыі з гэтага боку, то хаця б адзін са страхаў (страх натоўпаў) яна спрабавала перамагчы, дзейнічаючы ў правільным накірунку. Метад тэрапіі ўздзеяння – такую назву мае наўмыснае і перыядычнае сутыкненне людзей з іх страхамі – з�much"яўляецца дастаткова эфектыўным, але без рэгулярнай падтрымкі ѐн не толькі не дапамагае, а нават шкодзіць. Калі галоўная гераіня паступова закінула паездкі ў забітых людзьмі аўтобусах, страх вярнуўся да яе з новай сілай: «Вікторыя стаяла ўжо ў вітальні, калі яе раптам працяла вострае, як удар электратоку, адчуванне-ўпэўнасць: я не магу пакінуць кватэру, мне страшна» [2]. Найлепшы вынік у фінале твора даў ѐй нечакана другі метад – так званы метад наваднення, якім гераіня кіруецца несвядома. Сутнасць яго ў тым, што асоба павінна ўпэўніцца, быццам прадмет страху не ўяўляе Литературоведение 104 насамрэч ніякай небяспекі. Вікторыя выпадкова атрымала магчымасць пераканацца, што людзі, якіх яна баялася, самі зведваюць пастаянны страх: «Вось уціскаецца ў крэсла Загадчык, бачна, як ѐн нервуецца, як лісліва шэпча нешта на вуха Куратару – ці не пра яе звальненне? І перад гэтымі людзьмі яна баялася "ўпасці"? Іх ухваленні цаніла вышэй за ўласнае пачуццѐ годнасці? Вікторыі так смешна, што яна фыркае, бы дзяўчынка» [2]. Пры гэтым А. Брава падае і зусім іншае выйсце з «багны» боязі, а яе погляд разыходзіцца з класічным, бо ў творы неаднаразова ўзгадваецца і З. Фрэйд з яго псіхадынамічнай тэорыяй. Паколькі першапачаткова ўсѐ пачыналася з нелюбові маці да дачкі і нелюбові гераіні да сябе, самымі простымі і дзейснымі лекамі аўтар называе процілеглыя дзеянні: «Абдымі ж тую дзяўчынку, якая жыве ў табе, палюбі яе, бо ніхто, акрамя цябе, не можа гэта зрабіць. І яшчэ... даруй маме. Яна таксама – ахвяра, бо пражыла не сваѐ жыццѐ» [2]. Адной з найцікавейшых частак твора можна лічыць эпізод са сном, які бачыць Вікторыя, і яго сімволікай. Пісьменніца сама падае ключ да расшыфроўкі начной мроі: «Невыпадкова ў тых жа міфах матчына лона – гэта адначасова і сімвал магілы, а пажыццѐвая духоўная залежнасць ад маці – метафара смерці» [2]. Вікторыя прачынаецца ад таго, што маціняборжчыца зацягвае яе ў магілу, і ніяк не можа супакоіцца, асэнсоўваючы, што пажыццѐвая залежнасць ад маці праз пакінутыя ў спадчыну фобіі даўно зрабілі яе мѐртвай па адчуваннях. Яна не жыве – існуе. Праз вобраз матчынага лона пісьменніца выходзіць і на нацыянальнае пытанне. Пасля распаду СССР беларусы нарэшце атрымалі магчымасць жыць самастойна, незалежна ад «маці». Ды толькі, як і ў выпадку з пратаганісткай твора, былая сувязь побач з пастаяннымі ўказаннямі на «другаснасць» нацыі наклалі адпаведны адбітак на грамадскую свядомасць. Беларусам хочацца выразіць, нарэшце, свой боль і заняць годнае месца спаміж іншых народаў, але ці хопіць ім рашучасці перастаць азірацца на сваю парадзіху? «Калі чалавек хоча жыць, ѐн павінен змагацца і ахвяраваць сваѐй звернутай назад тугой, каб дасягнуць найвышэйшай даступнай яму вяршыні. Калі ж не... Чалавек (альбо народ) становіцца зачараваным смерцю. Менавіта гэты душэўны стан Вікторыя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

беспамылкова вызначала на тварах землякоў і ў сабе, стомленая марнымі высілкамі перамагчы страх, часам знаходзіла тую ж зачараванасць смерцю, яе спакоем і свабодай» [2], – падкрэслівае А. Брава. Беларусы бунтуюць, але не так, як іншыя. Вікторыя вырашыла развітацца са страхам, здзейсніўшы суіцыд, і краіна яе таксама патанае ў бездані самагубстваў не без прычыны. 105 Такім чынам, у аповесці А. Брава «Імя ценю – святло» ўсебакова разгледжаны страх і больш вузкая яго варыяцыя – фобія. Пісьменніца з глыбокім псіхалагізмам прасочвае прычыны ўзнікнення гэтых станаў, спосабы змагання чалавека з унутраным ворагам, з сабой, са знешнімі абставінамі. Прыватная чалавечая гісторыя праецыпуецца А. Брава на лёс краіны. Галоўная гераіня твора Вікторыя становіцца ў пэўнай ступені ўвасабленнем беларускасці, дзякуючы чаму змест твора значна паглыбляецца і разгортваецца перад чытачом ў новай – нацыянальна-грамадскай – перспектыве. Спіс літаратуры 1 Комер, Р.Д. Основы патопсихологии [Электронный ресурс] / Р.Д.Комер. – Режим доступа: https://bookap.info/genpsy/komer/gl25.sthm. –Дата доступа: 02.06.2021. 2 Брава, А. Імя ценю – святло [Электронный ресурс] / А. Брава. – Режим доступа: https://www.rulit.me/books/kamendancki-chas-dlya-lastavak-read-424513- 1.html. – Дата доступа: 02.06.2021.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ